Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне
бацькоў неданошаных дзяцей

# Гадавая справаздача

РАНО 2023




- На 1 студзеня 2024 года колькасць фактычных членаў аб’яднання – **310**

- Колькасць сямей, якія атрымоўваюць інфармацыйна-кансультацыйную дапамогу ў viber-чатах у рамках праекта «Рана Анлайн», – каля **1100**

# Асноўныя праграмы і праекты ў 2023 годзе:

- «Рана Анлайн»
- Праект па суправаджэнні ўразлівых катэгорый неданошаных дзяцей
- Псіхалагічная падтрымка
- Роўнае кансультаванне
- «Школа бацькоўства»
- «Дакранайся цеплынёй»
- Бонусная праграма

# «Рана Анлайн»

Колькасць удзельнікаў viber-чатаў - каля **1100**

Бацькі **ў фармаце 24/7** атрымоўваюць інфармацыйную і псіхалагічную падтрымку кансультантаў-валанцёраў, якія ўжо маюць свой бацькоўскі досвед.

Некаторыя з кансультантаў маюць медыцынскія спецыяльнасці і ў сваіх рэкамендацыях аб’ядноўваюць бацькоўскі і медыцынскі досвед.

У 2023 годзе ў чатах аказвае падтрымку бацькам 24 **кансультанта-валанцёра**

Тэрытарыяльнае размеркаванне ўдзельнікаў чатаў, у працэнтах:




За 2023 год в чаты «Рана Анлайн» далучыліся **249 чалавек**, з іх у чат «ПрэРана» (бацькі неданошаных дзяцей, якія знаходзяцца ў рэанімацыі) - **76 чалавек**, «Ранабілітацыя» (бацькі неданошаных дзяцей з асаблівасцямі развіцця) - **23 чалавекі**

# Праект «Выбудоўванне эфектыўных механізмаў абароны для паляпшэння становішча дзяцей з цяжкімі формамі інваліднасці і захворваннямі, якія абмяжоўваюць працягласць жыцця». Суправаджэнне сем'яў

## Інфармацыйна-прававая падтрымка бацькоў




У базу дадзеных сямей, якім патрэбна суправаджэнне, за 2023 год унесена **40 сем'яў**. **У 2023** годзе **18 дзяцей** зняты з суправаджэння. Сем'ям дадзены рэкамендацыі ад спецыялістаў ранняга ўмяшальніцтва і сацыяльнага суправаджэння. Для кожнага дзіцяці складзены індывідуальны рэабілітацыйны маршрут, далейшая праца з сем'ямі будзе працягнута ў межах дзейнасці Цэнтраў ранняга ўмяшальніцтва



Кансультацыі па сацыяльна-прававым суправаджэнні (спецыялістамі па сацыяльным суправаджэнні) па месцы пражывання сям'і - **48 візітаў у 18 сем'яў** на суправаджэнні - ва ўсіх рэгіёнах Беларусі




Хатняе візітаванне неданошаных дзяцей 1-га года з рызыкамі па інваліднасці ў раннім узросце спецыялістамі па раннім умяшанні і вузкімі спецыялістамі па профілі - **67 візітаў у 18 сем'яў** на суправаджэнні - ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

Колькасць Цэнтраў ранняга ўмяшальніцтва, супрацоўнікі якога ўключаны ў праект - **13**

HealthProm Беларускі дзіцячы хоспіс РАНО

# Праект па суправаджэнні сем'яў

## Навучанне супрацоўнікаў, якія ўключаны ў праект



**20 кастрычніка 2023** – форум для рэгіянальных спецыялістаў па сацыяльнай рабоце і сацыяльным суправаджэнні (сумесна з ГДА «Беларускі дзіцячы хоспіс»)



**25-26 лістапада 2023** – трэнінг «Сістэмнае валанцёрства як элемент устойлівага развіцця бацькоўскай супольнасці»

# Праект па суправаджэнні сем'яў

- Навучальныя мерапрыемствы для бацькоў і псіхалагічная падтрымка

Трэнінгі інструктара па ЛФК «Практычныя рэкамендацыі па масажу і ЛФК у хатніх умовах» - **10 трэнінгаў для 36 сем'яў**

(Мінск, Магілёў, Гродна, Віцебск, Гомель)



Групы псіхалагічнай падтрымкі бацькоў неданошаных дзяцей – **14 сустрэч для 64 бацькоў**

(Гродна, Магілёў, Мінск, Брэст, Віцебск, Гомель)





Трэнінгі вузкіх спецыялістаў – дзіцячага псіхолага, лагапеда-дэфектолага - 3

(Гомель, Орша, Магілёў)

# Праект па суправаджэнні сем'яў

## Маніторынгавыя візіты і партнёрскія сустрэчы

### 3 маніторынгавыя візіты

(Гомель, Бабруйск, Мінск ) – з наведваннем устаноў аховы здароўя, Цэнтраў ранняга ўмяшальніцтва, сустрэч з бацькамі і медыцынскімі спецыялістамі.

→ Інфармаванне аб праекце бацькоў неданошаных дзяцей і медыцынскіх спецыялістаў дазволіць **хутчэй пачаць працу** па рэабілітацыі дзяцей, палепшыць камунікацыю паміж бацькамі і медыцынскімі спецыялістамі, што станоўча ўплывае на якасць жыцця сем'яў ў будучыні

6 партнёрскіх сустрэч з прадстаўнікамі партнёрскіх арганізацый, мясцовых бацькоўскіх суполак

→ Праект **павялічвае патэнцыял мясцовых супольнасцей**, дае бацькам дадатковыя магчымасці для рэалізацыі сваіх інтарэсаў, што ўплывае на якасць дапамогі бенефіцыярам праекта, павышае рэабілітацыйныя і сацыяльна-прававыя магчымасці для дзяцей, якія атрымоўваюць падтрымку ў рамках праекта

Funded by the European Union
HealthProm Ensuring vulnerable children have the best start in life
Белорусский детский хоспис
Белорусский детский фонд / Belarusian Children's Fund
РАНО

# Праект па суправаджэнні сем'яў

- 19 кастрычніка 2023 года - справаздачная канферэнцыя (круглы стол) «Абарона правоў цяжкахворых дзяцей: вопыт супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння» (Сумесна з ГДА «Беларускі дзіцячы хоспіс»)

Мэта канферэнцыі: прадстаўленне ключавых вынікаў рэалізацыі праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі




Падчас канферэнцыі:

- каардынатар праекта ад РГА «Рана», старшыня праўлення нашага аб'яднання Вольга Скарбенка падвяла **вынікі кампанента праекта па суправаджэнні** неданошаных дзяцей з высокімі рызыкамі ўстанаўлення інваліднасці ў раннім узросце.
- Адбылася **прэзентацыя брашуры** «Мадэль супрацоўніцтва для абароны правоў цяжкахворых дзяцей у Беларусі», створанай партнёрамі праекта.
- РГА «Рана» **падрыхтавала і правяло секцыю** «Узаемадзеянне з дзяржаўнымі арганізацыямі: ад хатняга візітавання да сістэмнага суправаджэння сем'яў з неданошанымі дзецьмі» для спецыялістаў аддзяленняў выходжвання ўстаноў аховы здароўя РБ, а таксама спецыялістаў Цэнтраў ранняга ўмяшальніцтва.

Funded by the European Union
HealthProm Ensuring vulnerable children have the best start in life
Белорусский детский хоспис
Белорусский детский фонд / Belarusian Children's Fund
РАНО

- Праект «Выбудоўванне эфектыўных механізмаў абароны для паляпшэння становішча дзяцей з цяжкімі формамі інваліднасці і захворваннямі, якія абмяжоўваюць працягласць жыцця»

# Выніковая справаздача
# па праекце
# за перыяд 02.11.2020 - 15.12.2023 гг.

Funded by the European Union

HealthProm
Ensuring vulnerable children have the best start in life

белорусский детский хоспис

Белорусский детский фонд
Belarusian Children's Fund

РАНО

# Псіхалагічная падтрымка



- Вочныя сустрэчы «ПраЖывая»
- Падтрымка ў рамках праекта «Рана Анлайн»

Псіхалагічнае суправаджэнне бацькоў – важны накірунак нашай працы, які ў рознай ступені рэалізуецца ў рамках амаль усёй нашай дзейнасці.

У 2023 годзе мы распачалі вельмі важны для нас фармат штомесячных вочных груп псіхалагічнай падтрымкі для бацькоў неданошаных дзяцей, якія зараз знаходзяцца ў рэанімацыі.

У рамках праекта «ПраЖывая» у 2023 годзе псіхолаг Вольга Скарбенка правяла 9 груп псіхалагічнай падтрымкі, 29 бацькоў неданошаных дзяцей прынялі ўдзел у гэтых сустрэчах у Мінску



# Роўнае кансультаванне

## Сустрэчы з бацькамі неданошаных дзяцей ва ўстановах аховы здароўя

Пры разглядзе праблемы заўчасных родаў і неданошанасці **роўны кансультант – гэта бацька неданошанага дзіцяці, які мае асабісты досвед бацькоўства**, і яго роля - інфармацыйная і псіхалагічная падтрымка «маладых» бацькоў, якія зусім нядаўна сутыкнуліся з праблемай заўчасных родаў.

Чым раней маці і бацька сустрэнецца з роўным кансультантам, тым яны **прасцей і хутчэй адаптуюцца** да новых умоў свайго жыцця і жыцця сваёй сям'і, і змогуць больш эфектыўна дапамагчы свайму дзіцяці падчас рэабілітацыйных мерапрыемстваў.

У 2023 годзе адбылося **32 сустрэчы роўных кансультантаў** ва ўстановах аховы здароўя ва ўсіх рэгіёнах Беларусі




# Праект «Школа бацькоўства»

## Трэнінгі ва ўстановах аховы здароўя

### Трэнінгі кансультантаў па грудным гадаванні

ва УАЗ «Віцебскі абласны клінічны радзільны дом № 2»
і УАЗ «Гомельская абласная клінічная бальніца»






# Экспертнасць бацькоўскай супольнасці

16 мая 2023 - **Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ)** правяла вэбінар для асоб, якія вызначаюць палітыку ў галіне аховы здароўя па тэме методыкі «кенгуру», практыцы ўжывання гэтага метаду і даследаванняў яго эфектыўнасці. У вэбінары прыняла ўдзел старшыня праўлення РГА «Рана» Вольга Скарбенка.

З апошнімі метадычнымі рэкамендацыямі, падрыхтаванымі Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя, па тэме выкарыстання метада «Кенгуру» (на ангельская мове), можна пазнаёміцца тут і тут




11 лістапада 2023 - вэбінар для бацькоў, падапечных Цэнтра падтрымкі ўсынавіцеляў **«Родныя Людзі»** па праблемах і задачах развіцця неданошаных дзяцей.

Вэбінар правяла псіхолаг, старшыня праўлення РГА «Рана» Вольга Скарбенка.




Падчас вэбінара былі падняты **тэмы ўзаемасувязі і ўплыву працяглага знаходжання дзяцей у дэпрывацыйных умовах** устаноў на розныя аспекты развіцця неданошанага дзіцяці, і як **сям'я і блізкія дарослыя могуць садзейнічаць нівеляванню наступстваў неданошанасці**

# Партнёрскае ўзаемадзеянне

26 -27 жніўня 2023 – удзел у «Першакласным свяце».

Арганізатар – Дзіцячы інтэлектуальны клуб «БэбіУм»

3-5 лістапада 2023 – удзел у 10-ай спецыялізаванай выставе-інтэрактыве «Мацярынства і дзяцінства».

Арганізатар – ВУП «Экспафорум»












# Інфармацыйныя кампаніі EFCNI

1-7 жніўня 2023 –
Сусветны тыдзень груднога гадавання
(Сустрэчы з кансультантамі па грудным гадаванні ў Гомелі і Віцебску)






22 мая 2023 –
Сусветны дзень прээклампсіі



# Дабрачынныя акцыі

5 верасня - Міжнародны Дзень дабрачыннасці




#ШчодрыАўторак - штогадовы дзень дабрачыннасці



# Праект «Дакранайся цеплынёй»

**У рамках праекта «Дакранайся цеплынёй» мы прапануем усім ахвотным:**

- звязаць шкарпэткі і шапачкі, камізэлькі і пледзікі для неданошаных дзяцей, якія знаходзяцца на этапах рэанімацыі і выходжвання;
- пашыць чахлы, матрацыкі для кювеза, неабходныя для стварэння камфортных светлавых і пазіцыйных умоў, набліжаных да ўлоння маці;
- звязаць «сонейкі» – самыя першыя цацкі неданошаных дзяцей;
- ахвяраваць прадзіва і іншыя матэрыялы, неабходныя для стварэння вязаных і швейных вырабаў для неданошаных нованароджаных дзяцей.



**Мы працягваем нашы майстар-класы па вязанні ў розных гарадах Беларусі.**

У 2023 годзе мы перадалі ва установы аховы здароўя, дзе выходжваюцца неданошаныя дзеці нашай краіны, **больш за 600** камплектаў вязаных рэчаў! Дзякуй усім валанцёрам, якія ўдзельнічаюць у нашым самым цёплым праекце!

# Карпаратыўная сацыяльная адказнасць (КСА)

Арганізацыя і правядзенне святочных мерапрыемстваў РГА «Рана»



EVENT MAKERS
Creative event marketing & Production

Лучшая улица by VULITSA EZHA

РГА «Рана» - партнёр праграмы «Дабрачынныя паездкі» Яндекс Go ў Беларусі

Яндекс Go



Салодкія падарункі да навагодніх святаў для валанцёраў і супрацоўнікаў РГА «Рана»

Айфон






Падарункі для мам на другіх этапах выходжвання да Міжнароднага дня неданошаных дзяцей 17 лістапада

BURSHTAT

Доброном

Копеечка

Супермаркет для детей Буслік

SamoTamo

Зніжэнне ўзнагароджання за выкарыстанне Праграмнага комплексу кампаніі СТАА «АЙ ПЭЙ»

РАНО

ipay

# Бонусная праграма

Оптика АзъБукА

НОВАМЕД
МЕДИЦИНСКИЙ ЦЕНТР

12 мая
РАНО
6 лет!




**- 50 %**

*на консультацию невролога*
*с диагностикой раннего развития*

*предложение для членов РОО «Рано»,*
*количество мест ограничено*

ЦЕНТР ЗДОРОВОГО СНА
МНОГОПРОФИЛЬНЫЙ МЕДИЦИНСКИЙ ЦЕНТР

Центр семейной медицины
ДОКТОР ТУТ

НОВЫЙ ЛЕКАРЬ
МЕДИЦИНСКИЙ ЦЕНТР

ТОМОГРАФИЯ
МЕДИЦИНСКИЙ ЦЕНТР

# Супольнасць бацькоў РГА «Рана»

## 12 мая – дзень народзінаў РГА «Рана». Нам 6 гадоў!













# Супольнасць бацькоў РГА «Рана»

## 14 кастрычніка – Дзень маці







## «МамслётРана» – 2023 у Віцебску і Мінску





## «Таемны Зюзя»





# Супольнасць бацькоў РГА «Рана»

## 17 лістапада – Міжнародны дзень неданошаных дзяцей




### Рэспубліканская акцыя «Дзякуй за жыццё»



У рамках акцыі нашыя бацькі са сваімі ўжо пасталелымі неданошанымі дзецьмі сустракаюцца з персаналам установ аховы здароўя, дзе выходжваліся іх дзеці, каб яшчэ раз сказаць «дзякуй».

Акцыя адбылася ў Мінску, Брэсце, Віцебску, Наваполацку, Гродна, Гомелі, Магілёве, Пінску

# Наша дзейнасць магчыма толькі пры падтрымцы неабыякавых людзей. Дзякуй за вашу дапамогу!

На галоўнай старонцы сайта rano.by
вы можаце перевесці дабрачыннае ахвяраванне.
Проста націсніце на кнопку **Помочь сейчас**

Дапамагчы праз сістэму ерип:

- Грамадскія аб'яднанні / Общественные объединения
  - Дапамога дзецям, дарослым / Помощь детям, взрослым
    - Рана / Рано
      - Дабрачынны ўнёсак /Благотворительный взнос

# Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне бацькоў неданошаных дзяцей

Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне
бацькоў неданошаных дзяцей «Рана»

Паштовы адрас:

220002, г. Мінск, а/с 80

Тэл. +375(29)121-00-80

info@rano.by

Атрымальнік плацяжу:
РГА бацькоў неданошаных дзяцей «Рана»

Юрыдычны адрас: 220002, г. Мінск,
вул. Старажоўская, д. 8, пам. 17Н

УНП атрымальніка: 805003632

р/р атрымальніка: BY78 UNBS 3015 0385 1900 2000 9933

у ЗАА «БСБ Банк» аддзяленне № 9

Код банка (BIC): UNBSBY2X

Адрас банка: г. Мінск, вул. Я. Купалы, 25

**rano.by**

Мы побач!